**АНАМАСТЫКОН НАРЫСА УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА “ЗЯМЛЯ ПАД БЕЛЫМІ КРЫЛАМІ”**

***Скрабейка Н. І.*** *(УА «МДПУ імя І. П. Шамякіна»)*
***Навуковы кіраўнік*** *– В. В. Шур, д-р філал. навук, прафесар*

Уладзімір Караткевіч – яркая постаць у беларускай літаратуры XX ст. Ён аўтар раманаў, аповесцей, нарысаў. Уладзімір Караткевіч быў адным з тых аўтараў, якія ўслаўлялі Беларусь, чые творы перакладзены на многія мовы свету. Па яго сцэнарыях пастаўлены мастацкія фільмы, тэле- і радыёспектаклі. Яго творчасць вызначаецца рамантычнай акрыленасцю, высокай мастацкай культурай, патрыятычным пафасам, значнай пазнавальнасцю і гуманістычным гучаннем. Анамастыкон нарыса “Зямля пад белымі крыламі” разглядаўся часткова ў працах В. В. Шура, І. М. Зуевай і інш. Гэты твор У. Караткевіча не ўяўляюцца без анамастычных адзінак, якімі ён насычаны. Яны важнейшыя тэкстаўтваральныя кампаненты, выконваюць вызначальную ролю ў раскрыцці аўтарскай канцэпцыі. У нарысе выкарыстана 423 самыя розныя рэальныя онімы. Гэта антрапонімы – імёны: *Ян, Максім, Рыгор, Ада* і інш.; прозвішчы: *Чачот, Панчанка, Багдановіч, Шагал* і інш.; псеўданімы: *Цётка, Кандрат Крапіва, Кузьма Чорны, Ядвігін Ш., Цішка Гартны* і інш.; айконімы – назвы вёсак: *Цудноў, Мацяёвіцы, Жарцы, Студзёнка, Салтанаўка* і інш.; мястэчак: *Зэльва, Краснае* і інш.; гарадоў: *Ліда, Калінкавічы, Брэст, Гомель, Мазыр;* краін: *Германія, Францыя, Туркменістан* і інш.; гідронімы (патамонімы) – назвы рэк: *Прыпяць, Дняпро, Лоша, Смердзь, Дзвіна, Вісла, Ясельда* і інш.; азёр: *Палік, Нячарда, Чудскае, Свіцязь* і інш.; аронімы – назвы ўзвышшаў, гор: *гара Лысая, гара Маяк і інш.;* дрымонімы – назвы лесу: *Бярэзінская пушча, Лепячанская пушча, Белавежсская пушча, Мачтавы бор* і інш.; урбанонімы – назвы вуліц: *Захар’еўская, Карла Маркса* і інш.; эргонімы – уласныя назвы арганізацый, прадпрыемстваў: кінатэатр *“Кастрычнік”,* кінатэатр *“Партызан”,* кінастудыя *“Беларусьфільм”,* аўтазавод *“МАЗ”* і інш.; эклезіонімы – назвы цэркваў: *сабор Спаса-Ефрасінні, Сафійскі сабор* і інш.; планетонімы – назвы зон касмічнай прасторы: *Марс, Юпітэр, Венера* і інш.; хранонімы – уласныя імёны адрэзкаў часу: *Купалле*; тэонімы – імёны багоў, міфалагічных істот: *Зеўс, Геркулес* і інш.

Такім чынам, анамастыкон нарыса надзвычай адметны і своеасаблівы. У ім адлюстроўваецца нацыянальны, рэгіянальны, этнаграфічны каларыт Беларусі. Праз рэальныя онімы, якія найчасцей выкарыстоўваў пісьменнік, перадаюцца самыя

МГПУ им. И.П.Шамякина

розныя канатацыі – гістарычныя, этнаграфічныя, культуралагічныя і інш. Онімы ў яго творах умела этымалагізуюцца з выкарыстаннем самых розных прыёмаў і іншых мастацкіх умоўнасцей і сродкаў.



МГПУ им. И.П.Шамякина